**Антон Койпіш, Партыя БНФ**

Ёсць вядомае выказванне наконт таго, што “калі прыходзілі за іншымі я маўчаў, а калі прыйшлі за мной няма было каму казаць”... Мне падаецца, што нажаль, гэта вельмі нярэдка датычыцца і стану ў нашай краіне.

Я памятаю яшчэ гады паўтары таму ўсе ўзгадвалі Парсюкевіча, Кіма. Я памятаю ўсю гучнасьць “Працэсу 14”. Але што ж зараз? Выпусцілі аднаго з удзельнікаў гэтага працэсу — Кіма, але пасадзілі другога — Дубскага. Але ці чуем мы пра яго столькі ж? Нажаль, не. Выпусцілі аднаго з лідэраў прадпрымальніцкага руху - Парсюкевіча, але пасадзілі іншага - Аўтуховіча. Але ці чуем мы пра яго столькі ж? Нажаль, зноў не.

Менавіта Дзень Салідарнасці — гэта жывая ўзгадка пра ўсіх ахвяр рэжыму. Менавіта 16-га чысла кожнага месяца мы ўзгадваем пра тых на чыім месцы можа апынуцца любы з нас. І калі мы ня будзем нагадваць зараз пра Дубскага ці Аўтуховіча, хто нагадае пра нас?

# В Бресте задержали молодофронтовца Ивана Стасюка

*В Бресте задержан участник акции, приуроченной к отмечаемому 30 августа Международному дню исчезнувших людей.*



Как сообщил БелаПАН правозащитник Роман Кисляк, 30 августа около 14.50 трое брестских активистов зарегистрированного в Чехии международного общественного объединения "Молодой фронт" начали распространять на улице Пушкинской в областном центре информационный бюллетень, посвященный проблеме насильственных исчезновений людей и другим нарушениям прав человека в Беларуси и в регионе.

По словам правозащитника, через 10 минут к одному из них — Ивану Стасюку — подошли двое сотрудников милиции, которые сначала доставили его в опорный пункт охраны правопорядка. Затем — в Ленинский РОВД.

"По данным на 16.00, Иван Стасюк еще находился в милиции. Двое других участников акции, которые не были задержаны, распространили среди жителей города все имевшиеся при них более 200 экземпляров данного бюллетеня. Насколько мне известно, он отпечатан самими гражданами", — дополнил Кисляк.

www.naviny.by

# Ці трапяць Дзяды Марозы за краты?

Група Дзядоў Марозаў зьвярнулася да генэральнага пракурора Рыгора Васілевіча з заявай, у якой чыстасардэчна прызналася ў дзейнасьці ад імя незарэгістраванай арганізацыі.

Дабрахвотная здача адбылася ў Менску 15 кастрычніка: удзельнікі, апранутыя ў парадныя марозныя строі, аднеслі заяву ў генэральную пракуратуру Беларусі. У дакумэнце адзначалася наступнае:
“Паведамляем, што мы бярэм удзел у дзейнасьці грамадзкага аб'яднаньня Дзядоў Марозаў, якое не прайшло ва ўстаноўленым парадку дзяржаўную рэгістрацыю органамі юстыцыі Рэспублікі Беларусь. Гэтае незарэгістраванае аб'яднаньне цягам шматгадовага пэрыяду ажыцьцяўляе наступную дзейнасьць: арганізоўвае сьвяткаваньні Каляды і Новага году ў розных населеных пунктах Беларусі, распаўсюджвае калядныя і навагоднія падарункі (у тым ліку сярод непаўнагадовых), выступае на сходах, а таксама ў друкаваных ды іншых сродках масавай інфармацыі зь віншаваньнямі й найлепшымі пажаданьнямі”.

Аднак, з улікам таго, што дзейнасьць незарэгістраваных грамадзкіх аб'яднаньняў у Рэспубліцы Беларусь забароненая, ініцыятары акцыі папрасілі ў пісьмовай форме генэральнага пракурора даць бескампрамісную ацэнку іх «чорнай дзедамарознай справе».

Сваімі дзеяньнямі ўдзельнікі мерапрыемства імкнуцца зьвярнуць увагу на абсурднасьць артыкула 193.1 Крымінальнага кодэксу, які прадугледжвае адказнасьць за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі.



Акцыя адбылася ў межах кампаніі «Стоп 193.1!», ініцыяванай Асамблеяй НДА Беларусі.

P.S. “У выпадку ўстанаўленьня дадзеных аб сыстэмным удзеле ў незарэгістраванай арганізацыі, група Дзядоў Марозаў будзе прыцягнутая да адказнасьці”. Пра гэта паведамляецца ў лісьце Генэральнай пракуратуры за подпісам начальніка аддзела па наглядзе за захаваньнем правоў і свабодаў грамадзянаў П.У. Радыёнава.


# ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

Лістапад 2009, №2 (4)

Рэдкалегія:
Васіль Бароніч,
Марыйка Караткевіч,
Антось Валькаоў.

Друкуецца на ксэраксе.

Мова выданьня: беларуская, руская.

Распаўсюджваецца бясплатна.

Выдаецца нерэгулярна.

Наклад: 250 асобнікаў.

Кантакты: dzfby@i.ua

Сайт: www.zavadsky.org
www.ciwr.org


# Свиной грипп (A/H1N1)

«Свиной» грипп (англ. Swine influenza) — условное название заболевания людей и животных, вызываемого штаммами вируса гриппа.

Название широко распространялось в СМИ в начале 2009 года. Штаммы, ассоциированные со вспышками т. н. «свиного гриппа» обнаружены среди вирусов гриппа серотипа C и подтипов серотипа A (A/H1N1, A/H1N2, A/H3N1, A/H3N2 и A/H2N3).

Эти штаммы известны под общим названием «вирус свиного гриппа». Свиной грипп распространён среди домашних свиней в США, Мексике, Канаде, Южной Америке, Европе, Кении, материковом Китае, Тайване, Японии и других странах Азии. При этом вирус может циркулировать в среде людей, птиц и др. видов; этот процесс сопровождается его мутациями...




## Меры профилактики гриппа и ОРВИ:

- избегать прикосновений к своему рту и носу;
- регулярно и тщательно мыть руки с мылом или протирать их спиртосодержащим средством для обработки рук;
- избегать тесных контактов с людьми, которые могут быть больными;
- по возможности, сократить время пребывания в местах скопления людей, а лучше не бывать там вообще;
- регулярно проветривать помещения путем открывания окон;
- вести здоровый образ жизни, в том числе достаточно спать, правильно питаться и сохранять физическую активность;
- организовать разумный режим труда и отдыха, богатое витаминное питание (мед, брусника, фрукты, лук, чеснок);
- с профилактической целью можно употреблять поливитамины, аскорбиновую кислоту;
- принимать профилактические противовирусные препараты, способ и порядок приема которых подскажут в аптеке:
  - капли «Гриппферон»;
  - таблетки «Циклоферон»;
  - таблетки «Арбидол»

## Если почувствовали недомогание, заболели:

- оставайтесь дома и, по возможности, не ходите на работу, в школу или места скопления людей;



- отдыхайте и пейте много жидкости;
- при кашле и чихании прикрывайте рот и нос одноразовыми носовыми платками;
- часто и тщательно мойте руки с мылом, особенно после кашля и чихания;
- информируйте членов семьи и друзей о вашей болезни и обращайтесь к ним за помощью в домашних делах, при которых необходимы контакты с другими людьми, таких как, например, покупки. Тем, кто ухаживает за людьми с признаками гриппа, нужно прикрывать рот и нос маской;
- немедленно обращайтесь за медицинской помощью. Заболевшим не нужно ходить в поликлинику, чтобы уменьшить риск распространения болезни. Они должны вызвать врача на дом;
- без назначения врача принимать какие-либо лекарства нельзя. Все лекарственные препараты, назначенные врачом, следует принимать в строго установленном порядке;
- строго следовать рекомендациям лечащего врача. В случае, если врач предлагает госпитализацию – немедленно соглашайтесь.

# Брэсцкі суд палюбіў міжнародныя канвенцыі

*14 верасня Суд Ленінскага раёна горада Брэста разгледзеў іск гарвыканкама да Ірыны Смірновай наконт змушэння яе заключыць дагавор арэнды на зямлю пад уласным домам.*

У свой час іск быў задаволены, але абласны суд накіраваў справу на новы разгляд, паколькі рашэнне было прызнанае няпраўным. Цяпер, амаль праз паўгода, суд вырашыў адкласці слуханне яшчэ на дзевяць месяцаў

Наступнае паседжанне суда прызначана на 1 чэрвеня 2010 года. Падстава: суд задаволіў хадайніцтва Ірыны Смірновай азнаёміць яе сястру са зменамі ў іскавай заяве гарвыканкама. Сястра з'яўляецца грамадзянкай Літвы. Паводле міжнародных канвенцый, падпісаных Рэспублікай Беларусь, на такія справы з удзелам грамадзянаў розных краін адводзіцца найменш шэсць месяцаў.

Нагадаем, што яшчэ да Новага года без ведама Ірыны Смірновай участак, на якім размяшчаецца яе бацькаўшчына – паўдома і сад – быў аформлены суседам-землямерам Юрыем Кузубам у арэнду. А сама Смірнова і яе сястра хочуць атрымаць зямлю ў пажыццёвае валоданне. Надзел у цэнтры Брэста можа каштаваць на сёння дзясяткі тысяч долараў. Гарвыканкам жа прапануе Смірновай арэнду, якая нават забароненая заканадаўствам.

Вынік судовага паседжання, падобна, задаволіў усіх, акрамя Юрыя Кузуба. Кажуць, за ягоным безаглядным імкненнем аформіць участак у арэнду стаіць адзін высокі аблвыканкамаўскі чыноўнік. А той перасягнуў ужо пенсійны век. І вось гарадскія чыноўнікі ды суд маюць тое рашэнне пра Бурыданава асла: час пройдзе, і ён сам па сабе здохне, бо рашэнне па сутнасці не будзе прынятае.

Пятро Васілеўскі (www.regionby.org)

# В Минске жестко разогнана акция «Мы помним»

*Акция оппозиции в память о бесследно исчезнувших 10 лет назад Викторе Гончаре и Анатолии Красовском была жестко разогнана. Буквально через 15 минут после начала, акция закончилась массовыми задержаниями. При этом силовики не давали журналистам снимать происходящее, видимо, опасаясь не нужной им огласки.*

Активисты оппозиции вышли сегодня на Октябрьскую площадь столицы к 18 часам. К началу площадь уже была заполнена сотрудниками милиции в форме и в штатском. Как сообщает «Хартия-97», общественный транспорт в районе площади не останавливался, а собирающихся людей обыскивали, чтобы изъять флаги, растяжки и портреты Гончара и Красовского.

По традиции несколько десятков человек выстроились вдоль проспекта Независимости с портретами Гончара и Красовского в руках.

Практически сразу на площади появились сотрудники ОМОНа. Начались задержания. Как сообщает «Наша ніва», журналистам не давали снимать происходящее, вырывая из рук фотокамеры и отводя в сторонку «поговорить».

Участников акции загрузили в автобусы и увезли. От начала акции прошло не более 15 минут.







Некоторые участники акции из-за отмены остановки транспорта опоздали на акцию. Они и остались стоять на опустевшей площади, держа портреты пропавших Виктора Гончара и Анатолия Красовского.

Задержанные были доставлены в Центральный ОВД Минска. Около 21.00 некоторых задержанных стали отпускать.

Как сообщает «Наша ніва», есть информация о том, что некоторые из задержанных были избиты, в том числе известный белорусский политик Николай Статкевич.

www.gazetaby.com
Фото: "Хартия-97"

# Ці патрэбны акцыі салідарнасці?

**Мікалай Дзямідзенка, "Малады Фронт"**
Акцыі скіраваныя на салідарызацыю ў грамадстве як паветра неабходныя ў сёнешней Беларусі. Перааадоленне страху і публічная заява аб несправядлівасці і зле ёсьць тое што і вызваліла многія народы, напрыклад з Еўропы гэта скінула ярмо камунізма.

Безумоўна, мы будзем на плошчы 16 лістапада ня гледзядзячы ні на што.




**Анатоль Лябедзька, АГП**
Для мяне акцыі салідарнасці узялі пачатак, калі дэпутаты Верхоўнага Савета 13-га склікання выйшлі з партрэтамі свайго былога калегі Віктара Ганчара да адміністрацыі Лукашэнкі. З таго часу я, калі знаходжуся ў Менску, заўсёды выходжу на Кастрычніцкую плошчу. Я лічу гэтыя акцыі важнымі і актуальнымі дагэтуль. І нават ня важна, колькі чалавек выходзіць на іх, 2 ці 3, бо гэта выходзяць самыя нераўнадушныя людзі. І яны вельмі рызыкуюць, бо дзеянні сілавікоў кожным разам становяцца больш непрадсказальныя.

Мы, сябры Аб'яднанай Грамадзянскай Партыі, прыйдзем на акцыю 16 лістапада. І заклічам на яе ўсіх тых, для каго салідарнасць — не толькі слова і набор гукаў!

**Вячаслаў Сіўчык, рух "Разам!"**
Лічу асабліва неабходнымі акцыі салідарнасці. Мяне зяхапляе мужнасць моладзі, якая не змірылася з панаваннем дыктатуры і выходзіць кожны месяц на вуліцы. І яшчэ вельмі важна, што акцыі праходзяць пад час таго, як за кратамі знаходзяцца Аўтуховіч, Асіпенка і Дубскі. Акцыі аказваюць падтрымку і падбадзёрваюць тых, хто зараз знаходзіцца ў турме і адначасова знішчаюць верагоднасць таго, што заўтра там можа апынуцца нехта з нас.
16 лістапада я прыйду!

**Ніка Лазоўская, "Маладая Беларусь"**
Акцыі салідарнасці, па-першае, патрэбныя грамадзтву, каб людзі бачылі што пытанні аб палітычных знікненнях, прызыву моладзевых лідэраў у войска і палітычных арыштах не зніклі. Яны носяць інфармацыйны характар, даючы насельніцтву інфармацыю пра бязмежжа, і супрацьзаконныя дзеянні уладаў.

Па-другое, акцыі аб'ядноўваюць людзей, саміх актывістаў, паказваюць прыклад салідарнасці.

Па–трэцяе, гэтыя акцыі падтрымліваюць дух імкнення да пераменаў, паказваюць уладзе тое, што нас не спыніць, нягледзячы на ўсе рэпрэсіі. З іншага боку, увесь свет бачыць, што так званая лібералізацыя, гэта проста слова. якому улада надала свой сэнс.
Я буду на плошчы разам з сябрамі і паплечнікамі.

**Андрэй Крэчка, Моладзь БНФ**
Салідарнасьць — высокое пачуццё. Яно ня толькі дапамагае рэпрэсаваным адчуць падтрымку, але і яднае салідарных людзей, робіць іх моцным цэлым, здольным змагацца за свае каштоўнасці і ідэі. Калі ты сядзіш у РАУСе, калі цябе выпускаюць з турмы, ці з залі суда, і ты бачыш людзей, якія прыйшлі цябе падтрымаць — гэта надае моцы, натхняе і маральна дапамагае.

У Беларусі зараз ёсць палітвязні, ёсьць палітвайскоўцы, ёсьць зьніклыя бяз звестак... Гэтым людзям, іх родным патрэбна падтрымка. Давайце хаця б раз на месяц, 16-га, узгадваць пра гэтых людзей, падтрымліваць, бо яны — ахвяры рэжыму, якія змагаюцца за лепшую будучыню для Беларусі і беларускага народа.

**Паліна Дзякава, "Еўрапейская Беларусь"**
Я лічу патрэбнымі акцыі салідарнасці, таму што на іх вельмі моцна адчуваецца агульны дух, настрой усіх тых, хто не пабаяўся выйсці і выказаць сваё меркаванне публічна, а не сваякам ды сябрамі па сакрэту. Гэты настрой падпітвае ісці далей, негледзячы ні на што, ён аб'ядноўвае ўсіх тых, хто ў сённяшняй Беларусі змагаецца супраць гвалту, прымусу і прыгнёту таталітарнай улады. І менавіта гэты настрой дапаможа аднойчы дабіцца ўсім нам галоўных мэтаў. Таму, на мой позірк, рызыкуючы і пераборваючы свой страх, але ж трэба ўдзельнічаць у акцыях салідарнасці.

Я і мае паплечнікі абавязкова будзем на плошчы!

**Алексей Бондарь, политзаключённый**
Я считаю любые проявления солидарности крайне важными. Характер бандитской власти таков, что свой народ она не уважает и ни во что не ставит. Надо признать, что этому крайне способствуют равнодушие и безразличие, с которым беларусы в большинстве своем воспринимали все происходящее, вплоть до убийств оппозиционных политиков.

Любое проявление сплоченности, солидарности воспринимается режимом как вызов самой его сущности, ибо только в этом и есть главная опасность. Страх — вот главная беда и главный союзник режима. И требуется немалое гражданское мужество, чтобы, невзирая на дубинки, побои, аресты, в очередной раз призвать власти к ответу за исчезновения людей и потребовать освобождения политзаключенных. Поэтому я полностью поддерживаю тех, кто собирается по своей воле, осознавая свой выбор и поборов страх, выйти на Октябрьскую площадь и искренне благодарю их за это. Только мы сами сможем изменить нашу жизнь к лучшему, а люди, выходящие на площадь, уже сделали первый шаг — они изменили себя.

**Михаил Субоч, бывший полизаключённый**
Такие акции необходимы как вода человеку, прокладывающему себе путь в пустыне. Благодаря им люди, которые попали под безжалостный пресс режима, чувствуют себя не одинокими в своей беде, у них появляется надежда. Только благодаря внешней поддержке человек в тюремной камере или в здании милиции защищён от беспредела. Самому бороться со злом, которое там творится, довольно сложно.

Очень важно выходить именно на уличные акции, чтобы не потерять остроту восприятия тех проблем, которые не видны из окна нашего дома или офиса. Они во всей красе демонстрируют, на каком уровне находится диалог общества и властей, насколько государство ценит и уважает личность.

Кроме этого, массовые мероприятия являются естественным способом привлечь внимание сограждан к проблемам, которые нужно решать коллективно. Они могут стать катализатором, который разорвёт равнодушие в сердцах.

**Андрэй Кім, "Ініцыятыва"**
Я лічу абсалютна неабходнымі акцыі падтрымкі палітзняволенных. Яны нагадваюць, што мы мусім помніць пра тых, хто сядзіць за кратамі, і змагацца за іх вызваленне любымі негвалтоўнымі метадамі.

Я прыйду 16 лістапада на акцыю.

**Мікалай Статкевіч, "Еўрапейская кааліцыя"**
Такія акцыі вельмі патрэбныя. Па сутнасці, вельмі патрэбныя для тых, хто мае пачуццё ўласнай годнасці, каб супрацьстаяць тым людзям, якія гвалтоўна захапілі ўладу; тым, хто хлусіць нам з экранаў тэлевізараў і са старонак газет; тым, хто пужае нас і тым, хто забіваў людзей, якія проста хацелі іншай долі для свайго народу і краіны. Дзень Салідарнасці патрэбен для таго, каб захаваць сваю ўласную годнасць!